

# 2024/2025 учебный год

ВЫХОДНЫЕ И ПРАЗДНИЧНЫЕ ДНИ — КАНИКУЛЫ — ДОПОЛНИТЕЛЬНЫЕ КАНИКУЛЫ ДЛЯ УЧЕНИКОВ I–II КЛАССОВ

**СЕНТЯБРЬ**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| Вт | | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| Ср | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| Чт | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| Пт | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| Сб | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| Вс | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |

**ДЕКАБРЬ**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| Вт | | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| Ср | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| Чт | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| Пт | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| Сб | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| Вс | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |

**МАРТ**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| Вт | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| Ср | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| Чт | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| Пт | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| Сб | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |
| Вс | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 | |

**ИЮНЬ**

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| Вт | | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| Ср | | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| Чт | | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| Пт | | 6 | 13 | 20 | 27 | |
| Сб | | 7 | 14 | 21 | 28 | |
| Вс | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 | |

**ОКТЯБРЬ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| Вт | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| Ср | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| Чт | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| Пт | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| Сб | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| Вс | 6 | 13 | 20 | 27 | |

**ЯНВАРЬ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| Вт | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| Ср | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| Чт | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| Пт | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| Сб | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| Вс | 5 | 12 | 19 | 26 | |

**АПРЕЛЬ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| Вт | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| Ср | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| Чт | 3 | 10 | 17 | 24 | |
| Пт | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| Сб | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| Вс | 6 | 13 | 20 | 27 | |

**ИЮЛЬ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| Вт | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| Ср | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| Чт | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| Пт | 4 | 11 | 18 | 25 | |
| Сб | 5 | 12 | 19 | 26 | |
| Вс | 6 | 13 | 20 | 27 | |

**НОЯБРЬ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 4 | 11 | 18 | 25 |
| Вт | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| Ср | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| Чт | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| Пт | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| Сб | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| Вс | 3 | 10 | 17 | 24 | |

**ФЕВРАЛЬ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 3 | 10 | 17 | 24 |
| Вт | | 4 | 11 | 18 | 25 |
| Ср | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| Чт | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| Пт | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| Сб | 1 | 8 | 15 | 22 | |
| Вс | 2 | 9 | 16 | 23 | |

**МАЙ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| Вт | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| Ср | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| Чт | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| Пт | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| Сб | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |
| Вс | 4 | 11 | 18 | 25 | |

**АВГУСТ**

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Пн | | 4 | 11 | 18 | 25 |
| Вт | | 5 | 12 | 19 | 26 |
| Ср | | 6 | 13 | 20 | 27 |
| Чт | | 7 | 14 | 21 | 28 |
| Пт | 1 | 8 | 15 | 22 | 29 |
| Сб | 2 | 9 | 16 | 23 | 30 |
| Вс | 3 | 10 | 17 | 24 | 31 |

Выхаванне і дадатковая адукацыя

**“Выхаванне і дадатковая адукацыя” — ПОДПИШИТЕСЬ!**

Индексы: **00515** (инд.)
**005152** (вед.)

# Магілёўшчына этнаграфічная:

*музейны маршрут*



Кожны рэгіён Беларусі прыўносіць свае ўнікальныя рысы ў агульнае этнаграфічнае палатно нашай краіны. Знаёміцца з гэтымі адметнасцямі надзвычай цікава. А спланаваць маршрут незабыўных этнаграфічных вандровак для дзяцей і дарослых дазволіць серыя тэматычных постараў, якая будзе прысвечана ўнікальным цэнтрам захавання народнай культуры ва ўсіх абласцях нашай краіны.

Раней мы вандравалі па Гродзеншчыне (№ 6/2024), Брэстчыне (№ 7/2024). А зараз запрашаем у Прыдняпроўе — на Магілёўшчыну.

У наступным нумары часопіса чакайце музейны маршрут па цікавых этнаграфічных цэнтрах Гомельшчыны.




## ДРЫБІН



Дрыбінскія валёнкі з натуральнай воўны вядомыя здаўна не толькі на Магілёўшчыне, а і па ўсёй Беларусі. Мясцовыя майстры-шапавалы вырабляюць гэты незаменны зімовы абутак і лямцавыя шапкі-магеркі больш за 200 гадоў. **Шапавальства** тут — не проста сезонны промысел, рамяство, а цэлая культура! Асновы майстэрства стагоддзямі перадаваліся ў сем'ях ад старэйшых малодшым, існавала нават таемная мова шапавалаў — катрушніцкі лемезень. На ёй майстры размаўлялі падчас працы ў іншых мястэчках у мэтах бяспекі і захавання прафесійных сакрэтаў.



У наш час старадаўні промысел не згубіўся. Яго адраджаюць і развіваюць мясцовыя майстры і супрацоўнікі **Дрыбінскага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея**. Тут можна пазнаёміцца з тэхналогіяй стварэння валёнкаў, паслухаць, як гучыць катрушніцкі лемезень, а таксама сваімі рукамі стварыць сувенір з мяккай, цёплай воўны. А набыць славутыя дрыбінскія валёнкі і іншыя тавары мясцовых майстроў можна падчас **фестывалю "Дрыбінскія таржкі"**, які праводзіцца штогод у жніўні і працягвае старажытныя традыцыі мясцовых багатых кірмашоў.

*Прэзентацыя музея*













## ГЛУША



**Цэнтр рамёстваў** у пасёлку Глуша, што на Бабруйшчыне, — месца сілы для беларускіх ганчароў і ўсіх аматараў **ганчарнай справы**. Працуюць тут народныя майстры Рэспублікі Беларусь Юрый Боўда і Аляксандр Арлоў, якія працягваюць і ўдасканальваюць старажытныя традыцыі рамяства. А на Бабруйшчыне ганчары славіліся здаўна. Іх вырабы (посуд, цацкі, свістулькі) адрозніваюцца своеасаблівасцю прапорцый, сціплым дэкараваннем, асаблівасцямі ў канструкцыі крышак і ручак, а таксама спалучэннем бясколернай палівы з каларытам светла-чырвонай гліны. Посуд традыцыйна пакрываецца палівай толькі знутры, каб не прапускаў ваду, а зверху абварваецца ў малаку і задымліваецца.






Убачыць усе гэтыя тэхналагічныя працэсы, сваімі рукамі адчуць падатлівасць гліны, убачыць, як яна прымае жаданую форму, можна ў адмысловай ганчарні, якая з'яўляецца і майстэрняй, і музеем адначасова. Майстры-ганчары тут не толькі працуюць, але і перадаюць свае веды, свой вопыт ахвотнікам далучыцца да рамяства. А яно можа саслужыць добрую службу чалавеку, бо, як кажуць глушанцы: "Хто на гліне — той не згіне!"

Самыя цікавыя падзеі ў Цэнтры рамёстваў адбываюцца падчас **фестывалю народных промыслаў "Глушанскі хутарок"**, які праводзіцца штогод у пачатку кастрычніка.

*Анонс фестывалю*

## БЫХАЎ

Нашы продкі адным з самых моцных абярэгаў лічылі **саламянага павука**, якога падвешвалі да столі напярэдадні Каляд у пачэсным месцы — ля чырвонага кута. Лічылася, што ў саламяным павуцінні на працягу года заблытаюцца ўсе няшчасці і хваробы і сям'я будзе шчаслівай і моцнай. Майстэрства вырабу саламянага павука перадавалася звычайна ад маці дачцэ, таму ніякіх пісьмовых інструкцый не захавалася. Аднавіць прыгожую традыцыю продкаў здолелі на Быхаўшчыне. І сёння тэхналогія вырабу саламяных падвесных канструкцый у гэтым рэгіёне мае статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Беларусі.







*Відэасюжэт пра Быхаўскіх саламяных павукоў*

У Быхаве сабраная ўнікальная калекцыя павукоў-абярэгаў, якая ўвесь час папаўняецца. Убачыць яе можна ў **Дзіцячай школе мастацкіх рамёстваў**. Там прадстаўлены больш за 150 экспанатаў, памер якіх — ад 25 да 130 см у вышыню. Павукі адрозніваюцца сваёй формай і абрадавым прызначэннем. Створана тут і картатэка мясцовых майстроў, якія валодаюць самабытным рамяством. Умельцы перадаюць свае сакрэты педагогам школы мастацкіх рамёстваў, дзецям — гэта значыць, што традыцыя не згубіцца і будзе развівацца. Садзейнічае гэтаму і **фестываль "Саламяны павук"**, які праводзіцца ў Быхаве раз у два гады ў апошнія дні масленічнага тыдня і пашырае кола аматараў народнага мастацтва.

